чэрвень 2020

**Тэкст дыктанта**
**для правядзення ўступных іспытаў у IX клас**
**ДУА «Мінскае абласное кадэцкае вучылішча»**

## Беларускае кавальства

Сярод розных рамёстваў адно з самых пачэсных месцаў займае кавальства. Кавальскае рамяство патрабавала майстэрства, ведання тэхналагічных сакрэтаў апрацоўкі матэрыялу. Умение выплавіць руду, вызначыць патрэбны працэнт дабавак, тэмпературу нагрэву, ступень загартоўкі лічылася амаль чараўніцтвам. Недарэмна праца каваля з'ўлялася адной з самых паважаных. Кавальства ў свой час адносілася да ліку рамёстваў спадчынных.

Без уласнага каваля не абыходзілася ніводнае паселішча. Калі трэба было падкаваць каня, назубіць серп, выкаваць завесу, ішлі да каваля. Добрага майстра ведала ўся акруга. Кавальскае рамяство было акружана арэолам таямнічасці, загадкавасці. Каваля параўноўвалі з чараўніком, які валодае цудадзейнымі сакрэтамі апрацоўкі жалеза.

Сярод мноства каваных рэчаў заўсёды можна ўбачыць і знайсці нямала цікавага і арыгінальнага. У розных кутках Беларусі можна сустрэць нямала цудоўных узораў кавальскага майстэрства: вароты, агароджы, рашоткі. Такія вырабы нагадваюць далікатныя карункі.

(125 слоў). Паводле Я. Сахуты